**Ю. А. Афанасьева**

## МУЗЫЧНАСЦЬ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК СПОСАБ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*5902053@mail.ru;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

Мэта дадзенага артыкула – выяўленне асаблівасцей рэпрэзентацыі нацыянальнай ідэнтычнасці праз музычнае ў мастацкай літаратуры. Вызначана, што гукавае мастацтва – форма выхавання чалавека і сродак нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Упершыню мелас і рытміка разгледжаны як элементы ментальнай карціны свету ў індывідуальна-аўтарскай рытмавай матрыцы.

***Ключавыя словы***: ідэнтычнасць; мелас; нацыянальны характар; паэзія; проза; рытм.

Усеагульнасць гукавага светаўспрымання, рытмізацыі асабістага і супольнага жыцця дазваляе вызначыць наяўнасць музыкі амаль ва ўсіх сферах чалавечага жыцця. Так, антычная эстэтыка надае спевам і гульням на розных інструментах прыкладное значэнне. Музыка непасрэдна звязана з выхаваннем і выпраўленнем характараў, стварэннем пэўнай псіхалагічнай устаноўкі асобы (этасу) і арганізацыі зменлівых душэўных станаў (патасу). Захоўваючы ў сабе міфічныя інтэнцыі, мастацтва настройвае чалавека на цэласнае бачанне этасу і свету. Як нацыянальныя міфы з’яўляюцца падмуркам устойлівага развіцця ўяўнай супольнасці, так і нацыянальны мелас дае падставы для яе фарміравання праз гукавую арганізацыю прасторава-часавага кантынуума і ўздзеянне на калектыўную падсвядомасць. Музыка як нацыянальна значны кампанент культуры становіцца ахоўнай абалонкай кожнага асобнага народа, фарміруючы матрыцу перадачы назапашанага ў пакаленнях вопыту.

Мелас і рытміка выступаюць у якасці двух музычных пачаткаў, якія структуруюць быццё. Пра іх падрабязна піша антычны філосаф Арыстыд Квінтыліян: «Трыма органамі мысліцца ўсякі рытм: зрокам, як у скоках; слыхам, як у спевах; дотыкам, як біццё пульсу. У дачыненні да музыкі рытм [адчуваецца] двума органамі, зрокам і слыхам. Рытмізуецца ж у музыцы рух цела, мелодыя, слоўны выраз. <...> Сапраўды, мелас мысліцца сам па сабе ў [нотных] постацях і бязладных мелодыях пры дапамозе аднаго рытму – як пры ўдарах і [адбіванні] каленяў, і пры дапамозе слоўнага выразу ў т. зв. свабодных песнях. Рытм [думаецца]: сам па сабе – у чыстым танцы: пры

дапамозе меласу – у каленах; пры дапамозе аднаго слоўнага выраза – у вершах з мастацкай дэкламацыяй…» (тут і далей пераклад з рус. мой. – *Ю. А.*) [1, с. 241]. Суадносіны меладычнага і рытмічнага пачаткаў ён вызначае наступным чынам: «…мелас – не звязаны з дзеяннем, бясформенны, ён выказвае сабою сэнс матэрыі з прычыны сваёй здольнасці да процілеглага. Рытм жа і лепіць яго самога [мелас] і рухае ў строгім парадку, выказваючы сабою стаўленне творцы да таго, што ствараецца» [1, с. 260]. Зліццё дзвюх катэгорый, іх прапорцыі вызначаюць тып музычнай культуры – напрыклад, Лацінская Амерыка і Афрыка маюць больш дынамічную рытміку, чым усходнія краіны [2, с. 34]. Беларуская музыка надзвычай меласная. Этнічныя асаблівасці родных спеваў, паводле музыказнаўцы Р. Р. Шырмы (1892 – 1978), можна апісаць наступным чынам: «Беларуская народная песня, заўсёды ясная, пластычная і багатая, часцей засмучаная, чым рэзвая і гуллівая, адзначаецца асаблівао задумаю аб жыцці і долі. З боку настрояў, мелодыі і рытму яна зусім самабытная. Цудоўная, шчырая, як народнае сэрца, мелодыя, высокапатэтычны верш народнае паэзіі з яго наяўнымі чаруючымі водразамі і зваротамі – усё гэта разам узятае падымае беларускую песню на высокі п’едэстал» [3, с. 11].

Пералічаныя вышэй асаблівасці музычнай культуры неад’емна звязаны з чалавечай фізіялогіяй. Так, інтанацыйная канцэпцыя музыкі Б. В. Асаф’ева звязвае прапанаваныя антычныя катэгорыі з тым, як чалавек гаворыць і мысліць: «За нашай прамовай са звёнаў-словаў (мова), і за нашым вымаўленнем музычных тонаў гучыць, існуючы, бесперапыннасць “тонавага”, галасавога напеву, у дачыненні да якога асобныя словы, асобныя музычныя гукі есць свайго роду асобныя “інтанацыйныя комплексы” <...> у іх, у гэтых вузлах канцэнтруецца сэнс, яны – вобласць інтэлекту, свядомасці; але жывы тонус гукавай мовы, <...> тоіцца ў цякучасці і бесперапыннасці эмацыйна-галасавога, цесна звязанага з дыханнем “тонавага” намагання, напружвання. Напружванне гэта сваёй цякучасцю адлюстроўвае бесперапыннасць мыслення, бо мысленне, як дзейнасць інтэлекту толькі часткова выяўляецца ў мільгаючай у свядомасці “перарывістасці” словаў, а яно істотна “мелосна”, “меладыйна”, цякуча і абумоўлена свайго роду “разумовым дыханнем” і рытмам <…> Вось гэту з’яву <…> я называю *інтанацыяй*» [4, с. 355]. Такім чынам, рытмічная арганізацыя меласу нацыянальнай песні зараджаецца пераважна ў вуснай прамове, фіксуе лінгвістычныя асаблівасці як асобнага індывіда, так і групы людзей. Інтанацыйны каларыт больш разнастайна праяўляе сябе ў вернакуляры – ён можа выкарыстоўвацца для спробы фіксацыі аўтэнтычнай прамовы на пісьме і спрыяе перадачы назапашанага вопыту нацыі, яе асаблівага рытму, схаванага ў патэрнах падсвядомага.

Узаемадзеянне музыкі і літаратуры паўстае заканамерным актам ўзаемаўплыву мастацтваў. Нацыянальная ідэнтычнасць у творчасці можа

быць адлюстравана некалькімі культурнымі кодамі адначасова, на што паўплывае і індывідуальнае адчуванне рытму творцам. Як кажа даследчык Т. Кабахідзе, «адэкватна перадаць мелас здольная толькі высокаарганізаваная паэтычная структура – мастацкая форма, пабудаваная на прынцыпах музычнай паэтыкі. У выглядзе, які можа ўспрыняць чалавек, мелас рэалізуецца ў часе як рытмічная, лагічна абумоўленая і па-мастацку мэтазгодная паслядоўнасць гукаў (музыка) або слова (паэзія)» [5, с. 186]. Навукоўца слушна адзначае, што апошняя па сваёй антыміметычнай прыродзе больш блізкая да музыкі, чым проза. Напрыклад, кажучы пра беларускую літаратуру, літаратуразнаўца Я. А. Лойка піша наступнае: «…музычны элемент вельмі багата ўплецены ў агульны літаратурны пояс, пачынаючы з «Песні пра зубра» М. Гусоўскага і заканчваючы творамі Ф. Багушэвіча, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа – гэты спіс бясконцы. Увогуле беларуская паэзія, асабліва перыяду Беларускага Нацыянальнага Адраджэння ў пачатку XX ст., вылучаецца выразнай музыкальнасцю. Гэта тычыцца і мовы і рытму. Напрыклад, кажучы пра вершы Я. Купалы, мы можам адчуць рытмы жніўеньскіх песень» [6, с. 158]. Адраджэнне іншага кшталту – Гарлемскі рэнесанс (англ. Harlem Renaissance, 1920–1935) у Амерыцы – таксама актуалізуе нацыянальны мультыкультурны мелас для выбудоўвання афраамерыканскай ідэнтычнасці. Афраамерыканскі паэт Лэнгстан Хьюз (James Mercer Langston Hughes, 1902–1967) у зборніку вершаў «Стомленыя блюзы» (*the Weary Blues*, 1926) вызначае пачатак выкарыстання блюзавай рытмікі і тэматыкі ў амерыканскай літаратурнай традыцыі. Аднак шэраг афраамерыканскіх пісьменнікаў гэтага часу займаюцца і этнічным рытмаўкладаннем у прозе. Даследчык І. В. Жук заўважае: «Проза – зона энтрапіі. <…> Яе тэкст скарыстоўвае магчымасці нацыянальнай прасодыі і ўсяго запасу ўнутранай структуры мовы, але індывідуальны слоўнік рытму празаічнага выказвання складваецца не столькі пад уздзеяннем законаў мовы, колькі адчуваючы эстэтычныя ўласцівасці слова як носьбіта розных тыпаў аўтарскай свядомасці. Адсюль становіцца відавочным, што калі проза наскрозь пранізана множнасцю перасячэнняў розных этычных, філасофскіх, гуманістычных пазіцый, абнятых абалонкаю слова, то і рытмавае існаванне празаічнага тэксту не можа быць ідэнтыфікавана з такою ж адназначнай дакладнасцю, як рытм вершаванага твора» [7, с. 219]. Разглядаючы асаблівасці мастацкага стылю Я. Брыля (Іван Антонавіч Брыль, 1917–2006), В. Быкава (Васіль Уладзіміравіч Быкаў, 1924–2003), М. Гарэцкага (Максім Іванавіч Гарэцкі, 1893–1938), І. Мележа (Іван Паўлавіч Мележ, 1921–1976), К. Чорнага (сапр. Мікалай Карлавіч Раманоўскі, 1900–1944) з пазіцый уласнай канцэпцыі метрадынамікі празаічнага выказвання, навукоўца гаворыць пра так званы «рытмічны інстынкт», адлюстраваны ў метрычных аўтарскіх эталонах, разглядае сістэму іх дынамічнага ўзаемадзеяння. Таксама

частотныя сітуацыі выкарыстання ў празаічным тэксце паэтычных прыёмаў – напрыклад, сінтаксічнага паралелізму, анафар, эпіфар, сімплак і г. д. у паэме ў прозе «Одзіум» Я. Сіпакова [8].

Такім чынам, музыка закладвае падмурак нацыянальнага характару. Катэгорыі меласу і рытмікі дэтэрмінуюць быццё формаў культур; іх прапарцыйныя ўзаемаадносіны залежаць ад сацыякультурнай сітуацыі таго ці іншага этнасу і г. д. Музыка звязана з працэсамі чалавечага мыслення і ўзнікнення гаворкі. Па-рознаму дзейнічаючы ў паэтычных і празаічных тэкстах, мелас і рытміка ў шматлікіх варыяцыях рэпрэзентуюць нацыянальныя асаблівасці ментальнай карціны свету ў індывідуальна-аўтарскай рытмавай матрыцы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Античная музыкальная эстетика. Вступ. очерк и собрание текстов *А. Ф. Лосева* ; предисл. и общ. ред. *В. П. Шестакова*. Москва : Музгиз, 1960.
2. *Холопова В. Н.* Музыка как вид искусства : уч. пособие. СпБ : Планета музыки, 2014.
3. *Шырма Р.* Прадмова да зборніка «Беларускія народныя песні» / Песня – душа народа : з літ. спадчыны. Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. С. 11–12.
4. *Асафьев Б. В.* Музыкальная форма как процесс. М. : Музыка, Ленинградское отделение, 1971.
5. *Кобахидзе Т. Д.* Миф и мелос в «Четырех квартетах» Т. С. Элиота // Литература двух Америк. 2022. № 13. С. 177–206.
6. *Лойка Я. А.* Музычная культура як фактар развіцця беларускай ідэнтычнасці // Актуальные проблемы гуманитарного образования : материалы VIII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22 –23 окт. 2021 г. Минск : БГУ, 2021. С. 156–162.
7. *Жук І. В.* Празаічны тэкст : дынаміка рытмавага існавання : Манаграфія. Гродна : ГрДУ, 2003.
8. *Русак В. У.* Прыёмы рытмізацыі лірычнай прозы (на матэрыяле паэмы «Одзіум» Янкі Сіпакова) // Труды БГТУ. Серия 4: Принт- и медиатехнологии. 2018. № 2. С. 87–93.